Журнал Белорусского государственного университета. История. 2024;4:14–23
Journal of the Belarusian State University. History. 2024;4:14–23

УДК 93/94:378.4(476-25)096 + 93/94(072)

# РОССИЙСКАЯ ИСТОРИЯ В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ: ТРАНСФОРМАЦИЯ ИНСТИТУЦИОНАЛЬНОСТИ, ПРАКТИК ПРЕПОДАВАНИЯ И ИССЛЕДОВАНИЙ (1921–2024)

***О. А. ЯНОВСКИЙ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** На основе широкого круга источников рассмотрены этапы институционализации российской истории как науки, направления, формы и методы организации ее преподавания в Белорусском государственном университете с момента начала работы учебного заведения до 90-летия со дня основания в его структуре отдельного исторического факультета (2024). Сделаны выводы не только о несомненном влиянии политической составляющей каждого этапа на этот процесс, стремлении преподавателей и студентов всех поколений повысить эффективность своей работы и учебы, но и об объективных требованиях времени, вопросах цивилизационного предназначения университета и внутренней логики его многовекторного развития.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; россиеведение; кафедра истории России; высшая школа Беларуси.

***Благодарность.*** Статья подготовлена в рамках реализации государственной программы научных исследований «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства» на 2021–2025 гг. (подпрограмма 1 «История»; тема 1.03.21 «Институционализация образования и науки Беларуси в условиях общественно-политических процессов 1920–1930-х гг.»).

# РАСІЙСКАЯ ГІСТОРЫЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ: ТРАНСФАРМАЦЫЯ ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАСЦІ, ПРАКТЫК ВЫКЛАДАННЯ І ДАСЛЕДАВАННЯЎ (1921–2024)

***А. А. ЯНОЎСКІ*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** На падставе шырокага кола крыніц аналізуюцца этапы інстытуцыяналізацыі расійскай гісторыі як навукі, напрамкі, формы і метады арганізацыі яе выкладання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце з моманту пачатку працы навучальнай установы да 90-й гадавіны з дня заснавання ў яго структуры гістарычнага факультэта (2024). Зроблены высновы не толькі аб несумненным уплыве на гэты працэс палітычнай сітуацыі на кожным этапе, імкненні выкладчыкаў і студэнтаў усіх пакаленняў павысіць эфектыўнасць сваёй працы і вучобы, але і аб аб'ектыўных запатрабаваннях часу, пытаннях цывілізацыйнага прызначэння ўніверсітэта і ўнутранай логікі яго шматвектарнага развіцця.

***Ключавыя словы:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; расіязнаўства; кафедра гісторыі Расіі; вышэйшая школа Беларусі.

***Падзяка.*** Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. (падпраграма 1 «Гісторыя»; тэма 1.03.21 «Інстытуцыяналізацыя адукацыі і навукі Беларусі ва ўмовах грамадска-палітычных працэсаў 1920–1930-х гг.»).

**Образец цитирования:**
Яноўскі АА. Расійская гісторыя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: трансфармацыя інстытуцыянальнасці, практык выкладання і даследаванняў (1921–2024). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2024; 4:14–23.
EDN: XVIRFK

**For citation:**
Yanouski AA. Russian history in the Belarusian State University: transformation of institutionality, teaching practices and research (1921–2024). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2024;4:14–23. Belarusian.
EDN: XVIRFK

**Автор:**
***Олег Антонович Яновский*** – кандидат исторических наук, профессор; заведующий кафедрой истории России исторического факультета.

**Author:**
***Aleh A. Yanouski***, PhD (history), full professor; head of the department of Russian history, faculty of history.
*helgoleg@mail.ru*

# RUSSIAN HISTORY IN THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY: TRANSFORMATION OF INSTITUTIONALITY, TEACHING PRACTICES AND RESEARCH (1921–2024)

*A. A. YANOUSKI* [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** Based on a wide range of sources, the stages of institutionalisation of Russian history as a science, directions, forms and methods of its teaching at the Belarusian State University from the beginning of activity of the institution to the 90th anniversary of the foundation of the faculty of history in its structure (2024), are considered. Conclusions are made not only about the undoubted influence of the political component of each stage on these processes, the desire of teachers and students of all generations to improve the efficiency of their work and study, but also about the objective requirements of the time, questions of the civilisational purpose of the university and the internal logic of its multi-vector development.

***Keywords:*** Belarusian State University; Russian studies; department of Russian history; higher education of Belarus.

***Acknowledgements.*** The article was prepared within the framework of the state scientific research programme «Society and humanitarian security of the Belarusian state» for 2021–2025 (subprogramme 1 «History»; topic 1.03.21 «Institutionalisation of education and science in Belarus in the context of socio-political processes of the 1920–1930s»).

## Уводзіны

Абагульненне станаўлення і развіцця гістарычнай навукі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, а таксама працэсу арганізацыі вучэбнай дзейнасці па яе выкладанні сведчыць аб тым, што з самага пачатку працы ўніверсітэта ў ім сфарміраваліся найважнейшыя напрамкі гістарычных даследаванняў. Адмысловае месца сярод іх заняло беларусазнаўства – сфера прафесійнай дзейнасці як гісторыкаў, так і археолагаў, этнографаў, мастацтвазнаўцаў, крыніцазнаўцаў, гістарыёграфаў, архівістаў. У той жа час ва ўніверсітэце глыбока вывучаліся агульнаславянская гісторыя і расійская гісторыя.

Даследчая праблема «Расіязнаўства ў Беларусі» ў краіне ў цэлым і ў БДУ ў прыватнасці да гэтага часу не была прадметам навуковых інтарэсаў айчынных і замежных гісторыкаў. Яна мае вялікі патэнцыял для асэнсавання вучонымі. Гісторыкі БДУ ўнеслі важкі ўклад у распрацоўку некаторых важных напрамкаў вывучэння і выкладання расійскай гісторыі ў школах і ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі. У апошнія гады расіязнаўчая тэматыка абмяркоўваецца з удзелам расійскіх калег. Адначасова расійскія гісторыкі супрацоўнічаюць з беларускімі калегамі для сумеснага спасціжэння мноства пытанняў цесна звязанай гісторыі дзвюх краін[1].

Станаўленне ў БДУ расійскай гісторыі як навукі і практыкі яе выкладання ішлі ў русле агульнага развіцця гістарычнай навукі ў Беларусі. Гэты шлях быў складаным і неадназначным, на ім можна вылучыць наступныя найбольш важныя этапы[2]:

1) станаўленне гістарычнай навукі ва ўніверсітэце (1920-я гг.);

2) развіццё і разбурэнне (рубеж 1920–30-х гг.);

3) рэалізацыя гістарычным факультэтам БДУ новых парадыгм (1934–1941 гг.);

4) развіццё гістарычнай навукі ў БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны (ВАВ);

5) вырашэнне актуальных пытанняў пры абмеркаванні і напісанні кнігі «Гісторыя Беларускай ССР» (1944–1950-я гг.);

6) замацаванне савецкіх парадыгм у гісторыі (канец 1950-х гг. – 1970-я гг.);

[1] См., например: Беларусь, Расія, Украіна: дыялог народаў і культур / склад.: Д. У. Караў, В. В. Масненка. Гродна : Юрсапрынт, 2013. 424 с. ; Россия и Беларусь: история и культура в прошлом и настоящем : сб. науч. работ / под ред. Е. В. Кодина. Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2016. Вып. 1. 168 с. ; Россия и Беларусь: история и культура в прошлом и настоящем : материалы Междунар. науч. конф. «Россия и Беларусь на историческом перепутье. 1917–1922 гг.», Смоленск, 19–21 окт. 2017 г. Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2017. Вып. 2. 352 с. ; Осмысление альтернативных концепций российско-белорусской истории / отв. ред.: И. И. Тучков, О. В. Солопова, О. В. Иванников. М. : Изд-во Моск. ун-та, 2018. 156 с. ; Историческая культура белорусов и россиян: формирование представлений о национальном и общем прошлом (памяти профессора В. Е. Козлякова). Краснодар : Кубан. гос. ун-т, 2023. 382 с. ; Россия и Беларусь: история и культура в прошлом и настоящем : материалы исслед. проекта «Современное зарубежное историческое белорусоведение: эволюция методологических подходов и оценок» / под ред. Е. В. Кодина. Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2021. Вып. 7. 130 с. ; Россия и Беларусь: история и культура в прошлом и настоящем : материалы по исслед. проблематике науч.-образоват. центра СмолГУ / под ред. Е. В. Кодина. Смоленск : Изд-во СмолГУ, 2023. Вып. 9. 209 с. ; История белорусских земель и белорусского государства. Краткий очерк. Материалы к лекционному курсу : учеб. пособие для вузов / под ред. В. В. Даниловича, О. В. Солоповой. СПб. : Алетейя, 2023. 102 с.

[2] Тут прыходзіцца рабіць агаворку: калі адносна храналагічных меж маюцца ўсе падставы быць дакладным (хоць і з улікам пэўнай умоўнасці пры дациіроўцы), то вызначэнне іх тэрміналагічна-сэнсавых назваў звязана з аўтарскім разуменнем галоўных акалічнасцей, якія вызначалі самыя важныя моманты ў абставінах і мэтах развіцця расійскай гісторыі ў беларускіх навуковых і адукацыйных інстытуцыях з натуральным яе ўключэннем у праблематыку беларускай гісторыі.

7) пераход ад застою і перабудовы да суверэнітэту (1980-я гг. – 2000 г.);

8) развіццё гістарычный навукі ў БДУ ў XXI ст.

Дадзеная градацыя ўлічвае, па-першае, найбольш істотныя характарыстыкі трансфармацыі, па-другое, распрацоўкі беларускіх гісторыкаў[3].

## Асноўная частка

Сёння, калі вышэйшая школа Беларусі падвяргаецца перманентным мадэрнізацыйным зменам, ёсць неабходнасць разгледзець сітуацыю, якая назіралася на падобным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці і нацыянальнай самасвядомасці, а таксама іх культурна-адукацыйнага забеспячэння. Гэтым этапам без перабольшвання можна лічыць 1920–30-я гг. Тады Беларусь перажывала своеасаблівы рэнесанс. Тады беларускі народ усвядомліваў сваю выключнасць. Тады нанова фарміравалася культурнае і адукацыйнае асяроддзе, у якім першае месца займала вышэйшая адукацыя, узноўленая (ці, дакладней, распачатая з нулявой адзнакі) дзякуючы дзейнасці БДУ. Тады востра стаяла пытанне аб тым, якія здабыткі мінулага ўзяць з сабой для пабудовы «новага свету» і выхавання новага савецкага чалавека, а ад чаго патрэбна раз і назаўсёды пазбавіцца.

У першыя гады існавання БДУ распрацоўка вучэбных планаў і праграм розных дысцыплін, вызначэнне напрамкаў навукова-метадычных распрацовак былі прэрагатывай факультэцкіх прадметных камісій, у якія ўваходзілі найбольш аўтарытэтныя прафесары і выкладчыкі. На факультэце грамадскіх навук (ФГН) сярод пяці прадметных камісій з кастрычніка 1921 г. дзейнічала і камісія па прадметах гістарычных у складзе прафесараў-гісторыкаў У. М. Дзьякава (старшыня), Дз. П. Канчалоўскага, У. І. Пічэты, У. М. Перцава, У. М. Ігнатоўскага, Ф. Ф. Турука, Д. А. Жарынава, М. М. Нікольскага, А. А. Савіча і прафесара-філосафа С. Я. Вальфсона. Дзякуючы намаганням камісіі быў сабраны адмысловы камплект навуковай і вучэбнай літаратуры для аддзела беларусазнаўства ўніверсітэцкай бібліятэкі: былі закуплены кніжныя зборы аўтараў, якія непасрэдна мелі адносіны да беларускай зямлі і збіралі крыніцы па яе гісторыі, культуры, пісьменнасці (В. Л. Дыла, П. М. Жуковіч, Я. Ф. Карскі, М. А. Янчук, І. П. Карнілаў, А. П. Сапуноў). Кнігі з бібліятэкі А. П. Сапунова, асабліва работы па гісторыі Віцебшчыны, у прыватнасці Полацка, і перш за ўсё «первоклассная библиографическая редкость – 1-е издание Статута Литовского» ўзбагацілі бібліятэку БДУ[4]. Была набыта нават частка бібліятэкі Янкі Купалы, якая «значительно пополнила Белорусский отдел рядом изданий по вопросам белорусоведения» [1, с. 43].

Разам з тым неабходна адзначыць, што пры скіраванні намаганняў на развіццё беларускага кампанента ў падрыхтоўцы першых універсітэцкіх гуманітарыяў выкладанню расійскай гісторыі на ФГН было адведзена значна больш часу. Так, А. А. Савіч на грамадска-педагагічным аддзяленні за два семестры прачытаў курс гісторыі Маскоўскай дзяржавы XVI–XVII стст., а на практычных занятках разабраў са студэнтамі гістарычныя крыніцы часоў смуты і абавязаў іх напісаць тры самастойныя работы. Рэктар У. І. Пічэта на эканамічным і прававым аддзяленнях акрамя курса «Гісторыя гаспадаркі Беларусі» прачытаў курс «Гісторыя народнай гаспадаркі за першую палову XIX ст. у Расіі», а на этнолага-лінгвістычным аддзяленні – курс «Гісторыя рускай культуры». Прафесар Д. А. Жарынаў для будучых эканамістаў і правазнаўцаў чытаў цыкл лекцый «Навейшая гісторыя Расіі ад XIX ст. да Кастрычніцкай рэвалюцыі», а будучым педагогам – цыкл лекцый «Гісторыя Расіі XIX ст. (да рэформы 1861 г.)». У першы час відавочнай была няздольнасць гэтых расіязнаўцаў выкладаць па-беларуску (магчыма, за выключэннем А. А. Савіча). Аднак расійская прафесура да мноства раней засвоеных моў актыўна дадавала пазнанне мовы беларусаў, каб выкладаць на ёй у тым ліку і расійскую гісторыю.

Пазбегнуць выкладання гіпертрафіраванай па колькасці вучэбных гадзін расійскай гісторыі было нельга ў сувязі з наяўнасцю знаўцаў якраз агульнарасійскай праблематыкі. Тут патрэбна адзначыць ролю У. І. Пічэты, які асабіста запрасіў у БДУ Д. А. Жарынава, А. А. Савіча і сам спачатку таксама быў ангажыраваны як расіязнаўца. Распрацоўка і выкладанне беларусазнаўчых курсаў, відавочна, былі больш запатрабаваны студэнцтвам і грамадскасцю толькі ў тым выпадку, калі гэта рабілася мясцовымі сіламі.

З-за кадравага «голаду», па сутнасці, чыталіся курсы, што ў сілу сваёй кваліфікацыі маглі забяспечыць выкладчыкі, якія аднымі з першых прыехалі

[3]См., например: *Корзенко Г. В.* Научная интеллигенция Белоруссии в 1944–1990 гг. (подготовка, рост, структура). Минск : Аскад, 1995. 76 с. ; *Михнюк В. Н.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.). Минск : Наука и техника, 1985. 286 с. ; *Моторова Л. А.* Развитие исторического образования в системе высшей школы Беларуси. 1944–1961 гг. Минск : БГУ, 2002. 114 с. ; Подготовка педагогических и научных кадров историков и развитие исторической науки в Беларуси: материалы респ. науч.-практ. конф., Гродно, 30 сент. 2004 г. Гродно : ГрГУ, 2005. 404 с. ; *Касцюк М. П.* Шлях да ісціны: гістарычная навука Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI ст. Мінск : Экоперспектива, 2015. 252 с .; *Шаўчук І. І.* Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады XX ст.). Брэст : Выд-ва БрДУ, 2007. 279 с. ; *Острога В. А.* Развитие научных и образовательных центров по новой и новейшей истории в Белорусской ССР. 1919–1991 гг. Минск : РИВШ, 2016. 428 с. ; Библиографический справочник научных трудов сотрудников исторического факультета БГУ (1921–1994) / сост.: И. В. Оржеховский, А. П. Игнатенко и др. Минск : Тип. «Победа», 1994. 204 с.

[4]Хроника // Тр. Белорус. гос. ун-та. 1922. № 1. С. 210, 212.

на сталую працу ў Мінск. Менавіта магчымасці выкладчыкаў у значнай ступені абумоўлівалі змест вучэбных планаў, а не наадварот. Так, у 1924/25 навучальным годзе на ФГН дзейнічалі аж 27 кафедр[5] (з іх 6 спецыялізаваліся на гісторыка-сацыялагічных дысцыплінах), што адпавядала навукова-педагагічнай кваліфікацыі прафесуры. Штатныя расклады кафедр прадугледжвалі да 6 лектараў па так званых тэхнічных прадметах – выкладчыкаў і кіраўнікоў практычных заняткаў (заняткі, «не носящие характера самостоятельной научной дисциплины»)[6]. Для метадычнага забеспячэння такіх заняткаў загадчык вучэбнай часткай рабфака БДУ М. П. Шкляеў нават ездзіў у Ленінград, каб адначасова азнаёміцца з вопытам выкарыстання «лабараторнага метаду выкладання»[7].

Студэнты ФГН, як у хуткім часе і педагагічнага факультэта, з першых дзён навучання наведвалі лекцыі і разглядалі на практычных занятках навуковыя тэксты, дакументы, статыстычныя дадзеныя і іншыя крыніцы. Але заняткі нярэдка зрываліся з-за недахопу адпаведных дапаможнікаў, збораў дакументаў, таму практыкаваліся семінарскія і так званыя прасемінарскія заняткі, дзе па заданні лектараў студэнты рэферыравалі манаграфіі, прававыя артыкулы, гістарычныя тэксты, каб потым абараніць засвоены матэрыял перад выкладчыкам. Абавязкова трэба было здаць два прасемінары (па агульных і гістарычных навуках).

Вучэбныя планы штогод даволі значна мяняліся. Гэтыя змены адлюстроўвалі не толькі кадравую праблему ва ўніверсітэце, перманентныя прыезды і ад’езды выкладчыкаў, але і імкненне прадметных камісій улічваць як навукова-метадычныя навацыі ў дзейнасці савецкай вышэйшай школы, так і палітычныя запатрабаванні зверху да падрыхтоўкі не проста інтэлігентаў-прафесіяналаў, а пралетарскіх «спяцоў». Вось чаму да выкладання ўсё больш сталі далучаць прадстаўнікоў зацікаўленых арганізацый, а таксама асоб з партыйных і ўрадавых інстанцый[8]. Так, будучым эканамістам у БДУ чытаў лекцыі беларускі партыйны лідар В. Р. Кнорын, а курс беларускай гісторыі вёў намеснік наркама асветы У. М. Ігнатоўскі (хаця, зразумела, адначасова Усевалад Макаравіч быў і прафесарам, і дэканам факультэта, для стварэння і функцыянавання якога прыкладаў каласальныя адміністрацыйныя і інтэлектуальныя намаганні). Такая практыка яшчэ ў студзені 1921 г. была разгледжана і адобрана аргбюро ЦК РКП(б), як, дарэчы, і ўстаноўка на тэрміновае напісанне і выданне камуністычных падручнікаў [2, с. 462, 464]. Адначасова вызначалася неабходнасць мець запасныя вучэбныя планы на выпадак, калі па распараджэнні Главпрафадукацыі або партыйных органаў патрэбна было б тэрмінова ўводзіць новыя курсы ці прадметы (курс «Германазнаўства» і ваенныя прадметы былі ўведзены ў 1923/24 навучальным годзе)[9].

Увогуле праблема пошуку новых форм, прынцыпаў, зместу вучэбнага працэсу савецкай вышэйшай школы была надзвычай актуальнай як для тых, хто ўзначальваў установы вышэйшай адукацыі, выкладаў у іх, з энтузіязмам прымаў логіку рэвалюцыйных змен, так і для тых, хто вымушаны быў у сілу жыццёвай неабходнасці толькі прыстасоўвацца да гэтых змен. Зразумела, што гэтыя пошукі так ці інакш былі абумоўлены ўзроўнем, на які выйшла вышэйшая школа дарэвалюцыйнай Расіі. Але зварот да вопыту мінулага не азначаў захаванне старога ладу, нават калі ў эфектыўнасці ранейшай практыкі не было ніякага сумнення. У 1925 г. у часопісе «Чырвоны сцяг» разгарнулася дыскусія наконт таго, якім чынам можна пазбавіцца ад «старых» метадаў выкладання[10]. Аўтар артыкула канстатаваў, што так званы Дальтон-план[11], які стаў набываць папулярнасць, не дае неабходнага выніку, бо ва ўніверсітэце слабая матэрыяльная база і вучацца вельмі розныя студэнты. Каб пераадолець

[5]Згадаем, што на той час кафедра не была падобнай на сучасныя структурныя вучэбна-арганізацыйныя і навуковыя адзінкі кафедры, бо з’яўлялася толькі ўвасабленнем наяўнасці прафесара ці дацэнта, якія маглі чытаць пэўныя курсы. І спецыялізацыя такога лектара вызначала профіль-назву кафедры. Сучасныя кафедральныя турботы тады былі сканцэнтраваны на дзейнасці названых прадметных камісій, якія складаліся амаль што з усіх наяўных прафесараў і дацэнтаў. Напрыканцы 1920-х гг. гэтыя камісіі былі ліквідаваны, іх функцыі пачалі выконваць кафедры. За больш чым 100 гадоў дзейнасці расіязнаўчай кафедры БДУ неаднаразова ажыццяўлялася яе перайменаванне, што было абумоўлена зменлівымі палітычнымі абставінамі. Вывучэнне не заўсёды адназначных у фармулёўках дакументаў, якія змяшчаюць эвалюцыю назваў самых розных навучальна-навуковых інстытуцый БДУ з 1936/37 навучальнага года, дазваляе прасачыць пераемнасць у вывучэнні і выкладанні расіязнаўчых дысцыплін на ўзроўні адпаведных структур (кафедр): кафедра гісторыі народаў СССР і гісторыі БССР (1936–1937 гг.), кафедра гісторыі народаў СССР (1937–1953 гг.), кафедра гісторыі СССР (1953 г. – верасень 1974 г.), кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду (верасень 1974 г. – жнівень 1991 г.), кафедра гісторыі СССР эпохі сацыялізму (верасень 1974 г. – жнівень 1991 г.), кафедра найноўшай гісторыі славянскіх краін (жнівень 1991 г. – чэрвень 1998 г.). На аснове апошняй кафедры ў чэрвені 1998 г. была створана кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Кафедра расійскай гісторыі (жнівень 1991 г. – студзень 1992 г.), якая была сфарміравана на базе кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду, трансфармавалася спачатку ў кафедру расійскай і славянскай гісторыі (студзень 1992 г. – чэрвень 1998 г.), а затым у сучасную кафедру гісторыі Расіі (з 8 чэрвеня 1998 г.).

[6]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (НАРБ). Ф. 205. Воп. 1. Спр. 55. Арк. 70, 75.

[7]Там жа. Спр. 80. Арк. 75.

[8]Там жа. Арк. 341, 342.

[9]Там жа. Ф. 101. Воп. 1. Спр. 2810. Арк. 10 адв.

[10]*Аснач В.* Аб выкладанні на медфаках // Чырвоны сцяг. 1925. № 7. С. 62.

[11]Дальтон-план – педагагічны падыход, які заснаваны на прынцыпах індывідуальнага навучання. У адрозненне ад традыцыйных метадаў ён не прадугледжваў наяўнасць класічнай класна-ўрочнай сістэмы заняткаў, а роля выкладчыка зводзілася да функцыі кансультанта.

такую сітуацыю, неабходна адшукаць пераходную ступень, перш чым прымяняць методыку, акрэсленую згаданым планам. Па гэтай прычыне намаганні педагагічнай навукі пастаянна былі скіраваны на пошук інавацыйных метадаў выкладання. Напрыклад, першы наркам асветы РСФСР А. В. Луначарскі ў шматлікіх працах выказваўся за тое, каб савецкі педагог авалодаў метадамі нагляднага навучання, і нават прадказваў, што ў хуткім часе ў гэты працэс побач з кнігай і іншымі сродкамі актывізацыі дзейнасці навучэнцаў увойдзе кіно [3, с. 129].

Пастаянныя пошукі эфектыўных метадаў і форм навучання мелі на мэце «за меншы лік часу добра і дасканала вывучыць тую ці іншую дысцыпліну»[12], для чаго патрэбна было перш за ўсё з самага пачатку лагічна звязаць вывучаемыя дысцыпліны і пазбегнуць зместавага дубліравання пры іх выкладанні. Каб дасягнуць пастаўленай мэты, неабходна было мець адпаведны расклад заняткаў, заснаваны на стабільных вучэбных планах хаця б асноўных курсаў. Між тым семестры і сесіі доўга былі дакладна не акрэсленымі па часе, многія заняткі вяліся «з калёс», бо некаторыя расійскія прафесары прыязджалі ў Мінск нерэгулярна. Пад іх графік і нават настрой праўленне (так называўся тагачасны рэктарат. – *А. Я.*) універсітэта і дэканаты факультэтаў вымушаны былі прыстасоўвацца.

У канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. кіруючым колам стала зразумела, што ідэалагізацыя ўніверсітэта – важнейшы напрамак, па якім павінны весціся арганізацыя вучэбнага працэсу і мадэрнізацыя выкладання. У беларускай прэсе друкаваліся адпаведныя «пераканаўчыя» артыкулы, у якіх абгрунтоўвалася гэта неабходнасць, выкрывалася «варожая шкоднасць» усіх ранейшых распрацовак у падрыхтоўцы савецкай інтэлігенцыі. Віталася чарговае «вычышчэнне» з універсітэцкіх аўдыторый 40 выкладчыкаў, фактычнае разбурэнне БДУ праз яго «рэарганізацыю» (маўляў, 8 тыс. студэнтаў, сабраныя ў адным месцы, якім на рубяжы 1920–30-х гг. стаў кампактны і адначасова шыкоўны новы ўніверсітэцкі гарадок, – гэта некіруемы і непрадказальны натоўп моладзі). Пастановай СНК БССР ад 7 ліпеня 1931 г. № 135-4 «Пра арганізацыю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» БДУ быў нізведзены да ўзроўню амаль што спецшколы па падрыхтоўцы кадраў для сярэдніх вучэбных устаноў (тэхнікумаў, рабфакаў, фабрычна-завадскіх вучылішчаў), малодшых навуковых работнікаў, малодшых выкладчыкаў устаноў вышэйшай адукацыі (асістэнт, «групавод»), а таксама «высококвалифицированных научных работников ВУЗ и ВТУЗ и научно-исследовательских институтов»[13] (тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала. – *А. Я.*) па фізіка-матэматычных і прыродазнаўчых дысцыплінах. С. Я. Вальфсон адзначаў, што рабочы клас паставіў задачу прывесці сістэму адукацыі ў адпаведнасць з інтарэсамі дыктатуры пралетарыята. Тэрмін падрыхтоўкі студэнтаў першай ступені навучання складаў 3 гады, другой ступені навучання – на 1–1,5 года больш.

З 1 кастрычніка 1932 г. быў уведзены «цвёрды» расклад заняткаў, які прадугледжваў 50 вучэбных тыдняў у год і шасцідзённы рабочы тыдзень. Адначасова лепшыя кадры ўніверсітэта былі кінуты на «перестройку методов преподавания в направлении обеспечения индивидуальной и самостоятельной работы студентов», пашырэнне «коллективных форм работы студентов»[14] і разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва паміж студэнтамі. Гучна было заяўлена, што БДУ бярэ абавязак «уничтожить» пераходы студэнтаў з універсітэта ў іншыя ўстановы вышэйшай адукацыі. З 1932/33 навучальнага года ва ўніверсітэце пачаў замацоўвацца ўніфіцыраваны навучальны год, згодна з якім у залежнасці ад курса навучання дакладна ўстанаўліваліся яго тэрмін, час канікул, даты сесій, абарон дыпломных прац. Галоўнай адметнасцю такога падыходу сталі падзел навучальнага года на два семестры і замацаванне дзвюх сесій. Згаданыя змены адбываліся ў сілу прыняцця пастановы ЦВК СССР ад 16 верасня 1932 г. «Аб вучэбных праграмах і рэжыме ў вышэйшай школе і тэхнікумах». У выкладчыкаў і студэнтаў заставаўся толькі адзін выхадны дзень. Былі акрэслены трохгадзінная штодзённая норма самастойнай работы для студэнтаў і дакладны час для вырашэння навуковых і метадычных пытанняў для выкладчыкаў[15].

Аднак адназначныя ўстаноўкі зверху было не так проста рэалізаваць унізе, ва ўніверсітэце. Працягласць 1932/1933 навучальнага года ўжо была скарочана на 15 %, студэнтаў пастаянна адцягвалі не толькі ад аўдыторных заняткаў, але і ад іх самападрыхтоўкі, бо ўзмацнялася барацьба з класавымі ворагамі, разгортваліся калектывізацыя вёскі і ваенізацыя вучэбнага працэсу. Разлік на выкарыстанне студэнцкага патэнцыялу быў аб'ектыўным. Нарэшце, зрывы заняткаў у БДУ адбываліся і па банальнай прычыне недахопу паліва для ацяплення шыкоўных будынкаў новага ўніверсітэцкага гарадка, які на самой справе такім і не стаў, таму што быў падзелены паміж мінскімі ўстановамі вышэйшай адукацыі пасля «разукрупнения» БДУ. У выніку «цвёрды» расклад пераглядаўся амаль штомесяц[16]. У сувязі з гэтымі акалічнасцямі ранейшыя праблемы і пошукі аптымальных метадычных прыёмаў, форм і напрамкаў выкладання заставаліся такімі ж актуальнымі ў другой палове 1930-х гг., як і ў часы станаўлення беларускай вышэйшай адукацыі.

[12]*Аснач В.* Аб выкладанні на медфаках... С. 64.
[13]*Вольфсон С. Я.* Фабрика пролетарских кадров специалистов // Рабочий. 1931. 8 июля.
[14]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 465. Арк. 4–6, 12.
[15]Там жа. Спр. 535. Арк. 2.
[16]Там жа. Спр. 588. Арк. 35.

Гістарычная навука і адукацыя пераўтварыліся ў поле барацьбы на «гістарычным фронце» ў грамадска-палітычных абставінах рубяжа 1920–30-х гг. Між тым краіне патрэбны былі свае летапісцы і знаўцы мінулага, таму натуральным было партыйна-ўрадавае рашэнне аб стварэнні асобных гістарычных факультэтаў спачатку ў некаторых універсітэтах СССР, а потым і ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі. У кастрычніку 1934 г. такі факультэт распачаў сваю дзейнасць у БДУ. Адно з вядучых месцаў у вучэбным працэсе на гэтым факультэце адводзілася выкладанню храналагічна і тэматычна структураванай гісторыі СССР. Тут патрэбна згадаць, што такі курс змяніў расійскую гісторыю ўжо напрыканцы 1920-х гг., а пасля стварэння на базе ўніверсітэцкага педагагічнага факультэта асобнага інстытута ў ім стала дзейнічаць самастойная кафедра гісторыі СССР.

На гістарычным факультэце БДУ адпаведны курс у разбіўцы на тэматычна-храналагічныя перыяды сталі чытаць выкладчыкі асобнай профільнай кафедры. Аднак яна была створана не адразу, а толькі праз два гады – у 1936 г. Яе назва, як ужо адзначана, некалькі разоў удакладнялася. Агульныя і спецыяльныя курсы па гісторыі СССР уяўлялі сабой аповед аб розных перыядах менавіта гісторыі Расіі. Гэтыя дысцыпліны чыталі прадстаўнікі новага пакалення беларускіх расіязнаўцаў, якія прыйшлі на змену тым, хто ў 1920-я гг. пачынаў спазнанне расійскай гісторыі ў натуральным яе спалучэнні з гісторыяй Беларусі. Зразумела, што мясцовыя ўмовы аб'ектыўна патрабавалі такога спалучэння. Толькі цяпер беларуская гісторыя не магла разглядацца асобна ад зместу гісторыі СССР. І наадварот, гісторыя ўсёй савецкай краіны павінна была прадстаўляць спалучэнне разнастайнай гісторыі саюзных рэспублік[17]. Гэта акалічнасць і стала адной з прычын сумяшчэння ў межах адной кафедры дзвюх вучэбных дысцыплін – гісторыі СССР і гісторыі БССР. Вось толькі колькасць лекцыйных гадзін па беларускай гісторыі ў перадваенныя гады няўхільна скарачалася. Так, па сведчанні публікацыі ў газеце «Рабочий» за 9 верасня 1934 г., у першы год працы факультэта на вывучэнне феадальнага перыяду рускай гісторыі ў рамках курса «Гісторыя СССР» (гэты блок чытаў прафесар М. А. Поташ) адводзілася 220 гадзін, а на той жа перыяд беларускай гісторыі (гэты блок чытаў дэкан гістарычнага факультэта акадэмік В. К. Шчарбакоў) адводзілася ўсяго 120 гадзін. Для падрыхтоўкі новага пакалення расіязнаўцаў ужо ў 1934 г. была адкрыта аспірантура.

Гісторыкі БДУ, якія ўз'ядналіся ў 1934 г. у сценах асобнага факультэта, сталі аднымі з самых актыўных адэптаў рэалізацыі новай канцэпцыі разумення ўжо не гісторыі Расіі, а гісторыі СССР, але пры гэтым перавага ў структуры курса і яго інфармацыйным насычэнні аддавалася якраз расійскай гісторыі. Гісторыю СССР, а таксама гісторыю Беларусі на факультэце чыталі і даследавалі галоўным чынам прадстаўнікі новага пакалення расіязнаўцаў і беларусазнаўцаў і вучоныя, якім пашанцавала выстаяць у першую хвалю рэпрэсій. Сярод такіх вучоных былі першы дэкан факультэта В. К. Шчарбакоў і яго першы намеснік Я. І. Карнейчык, іх калегі з розным творчым лёсам і рознымі абставінамі спасціжэння новага гістарычнага напрамку Д. А. Дудкоў, К. І. Кернажыцкі, І. Ф. Лочмель, К. М. Палікарповіч, М. А. Поташ, І. Т. Пшанічны, А. П. П'янкоў, К. І. Шабуня, Я. П. Шлосберг і інш. У пасляваенны перыяд да іх далучыліся прадстаўнікі трэцяга пакалення гісторыкаў, узгадаванага на самім гістарычным факультэце БДУ (Л. С. Абецэдарскі, М. П. Баранава, М. Д. Мельцар, А. І. Сідарэнка, М. Б. Фрыдман і інш.). Важна, што напярэдадні ВАВ і ў першыя пасляваенныя гады ўніверсітэцкае расіязнаўства зноў развівалі У. І. Пічэта і А. А. Савіч.

У 1930-я гг. гісторыя СССР разумелася шырока, але рэальна ўяўляла ў большай ступені гісторыю дарэвалюцыйнай і Савецкай Расіі, якая згуртавала вакол сябе брацкія народы. Курс «Гісторыя народаў СССР» плаўна трансфармаваўся ў курс «Гісторыі СССР» – «найважнейшай гістарычнай дысцыпліны», выкладанне якой ажыццяўлялася ў розным аб'ёме на ўсіх факультэтах БДУ. Колькасць працы на кафедры была вялікай. Напрыклад, у перадваенныя гады толькі на спецыялізацыі «гісторыя СССР» на 4-м курсе на вывучэнне згаданай дысцыпліны адводзілася 1210 гадзін, размеркаваных па 16 спецкурсах, што чыталіся як у абавязковым парадку, так і па выбары студэнтаў. Акрамя таго, студэнты павінны былі праслухаць 8 факультатыўных курсаў агульным аб'ёмам 100 гадзін. На 5-м курсе акцэнт пры падрыхтоўцы па гэтай спецыялізацыі рабіўся на вывучэнні дапаможных гістарычных дысцыплін. Таксама студэнты-выпускнікі павінны былі прайсці курс па гісторыі адной з рэспублік СССР і наведаць некалькі факультатываў. Вялікай была вучэбная нагрузка аспірантаў кафедры: на напісанне і навуковую апрабацыю дысертацыі адводзілася, паводле навучальных планаў, 2500 гадзін, а на паглыбленае вывучэнне гісторыі Расіі і СССР – 2200 гадзін. У 1938 г. на кафедры гісторыі народаў СССР было 9 аспірантаў, а у 1941 г. – 6 аспірантаў.

Выкладанне курсаў гісторыі СССР і гісторыі БССР набывала асобае значэнне і ў сувязі з абсалютызацыяй у савецкім грамадстве, а тым больш у навукова-адукацыйным асяроддзі, засваення вучэбнага прадмета «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», які стаў лёгкадаступным, таму што з верасня 1938 г. яго матэрыялы стала друкаваць газета «Праўда». Беларускія гісторыкі вылучаліся на першыя пазіцыі для «…глыбокага вывучэння гісторыі гераічнага

[17]Задача арганічнага спалучэння агульных і канкрэтных звестак у новым універсітэцкім курсе на працягу ўсіх 1930-х гг. вырашалася нават праз пошукі тэрміналагічнай дакладнасці ў яго назвах: «Гісторыя народаў СССР», «Гісторыя СССР».

шляху партыі бальшавікоў па сталінскаму падручніку». Вынікі такога навучання і вывучэння ўражвалі: у зімовую сесію 1937/38 навучальнага года на «выдатна» экзамен па гісторыі ВКП(б) здалі аж каля 90 % студэнтаў, тады як па гісторыі БССР – толькі 56 % студэнтаў[18]. Вось толькі праблема з падручнікамі па большасці вучэбных дысцыплін ва ўніверсітэце ніякім чынам не вырашалася. Аб ёй у чарговы раз нагадаў ва ўніверсітэцкай шматтыражцы вучоны сакратар БДУ, назваўшы галоўнай прычынай такога становішча тое, што вучэбная частка і кафедры БДУ да гэтага часу зусім не займаліся складання падручнікаў, а іх адсутнасць з'яўляецца тормазам у рабоце як студэнтаў, так і саміх выкладчыкаў. Зразумела, што прычына такога становішча бачылася ў тым ліку на як бы вышэйшым, «вучоным» узроўні, таму што ў Наркамасветы БССР і ў БДУ «арудавалі ворагі народа», а «агідныя нацыянал-фашысты выганялі мову вялікага рускага народа з беларускіх школ… зрывалі ідэйна-палітычнае выхаванне студэнцтва»[19].

Вераломнае нападзенне фашысцкай Германіі на СССР стала катастрофай для беларусаў. Разбурэнням падвергліся літаральна ўсе сферы жыцця, уключаючы адукацыю і навуку, якія за 20 папярэдніх гадоў толькі сфарміраваліся і набралі тэмп развіцця. У гады ВАВ нямала беларускіх гісторыкаў вялі барацьбу з ворагам непасрэдна на фронце. Тыя ж, хто па розных прычынах працягнуў прафесійную дзейнасць у тыле, займаліся пошукамі адзіна правільных фактаў, абставін і парадыгм, якія дазволілі б завяршыць доўгі працэс напісання гісторыі БССР у цесным звязку з расійскай гісторыяй і гісторыяй СССР. Дарэчы, першы рэальны вынік быў дасягнуты непасрэдна перад фашысцкай навалай. У артыкуле «История Белоруссии в советской историографии», надрукаваным у 1942 г. у юбілейным зборніку «Двадцать пять лет исторической науки в СССР», У. І. Пічэта прывёў цікавую інфармацыю аб тым, што праца Інстытута гісторыі АН БССР над марксісцка-ленінскай гісторыяй Беларусі ў 1941 г. была ўвасоблена ў першай частцы выдання «Нарысы па гісторыі Беларусі». Уладзімір Іванавіч са шкадаваннем канстатаваў, што падчас бамбардзіроўкі Мінска нямецкай авіяцыяй амаль увесь тыраж кнігі загінуў, захавалася толькі некалькі асобнікаў. У. І. Пічэта сцвярджаў, што супрацоўнікі інстытута (А. П. П'янкоў, І. Ф. Лочмель, У. І. Пічэта) распрацавалі першую частку падручніка па гісторыі Беларусі для вышэйшых навучальных устаноў, дзе ахопліваецца перыяд ад першабытнасці да аграрна-сялянскай рэформы 1861 г., і вядуць падрыхтоўку да друку другой (з 1861 г. па 1914 г.) і трэцяй («от начала мировой войны до наших дней») частак [4, с. 181].

У жніўні 1945 г. у Маскве адбылася 4-я ўсесаюзная нарада кіраўнікоў кафедр грамадскіх навук. Упершыню прадстаўнікі кафедр гісторыі СССР не толькі ўдзельнічалі ў агульных пасяджэннях, але і арганізавалі работу самастойнай секцыі, гэта значыць, былі прыроўнены да калег з партыйна-грамадскіх кафедр. На секцыі быў абмеркаваны шэраг пытанняў аб удасканаленні навуковага вывучэння гісторыі СССР і яе выкладання студэнтам універсітэтаў і педагагічных інстытутаў. Даклады большасці сталічных гісторыкаў тэматычна ахоплівалі розныя праблемы і храналагічныя адрэзкі. Але амаль усе выступоўцы імкнуліся адлюстраваць выключны ўплыў рускага народа на шматлікія сферы жыцця і гістарычнага развіцця іншых народаў Русі, Расіі ці СССР. Толькі ў дакладах У. І. Пічэты, А. І. Казачэнкі і К. М. Касачэўскага[20] былі разгледжаны асобныя абставіны ў гісторыі беларускага і ўкраінскага народаў. Аднак і гэтыя гісторыкі ўсё ж акцэнтавалі ўвагу калег на выключнай ролі «русского народа в исторических судьбах славянских народов» [5, с. 205].

Зыходзячы з таго, што развіццё расіязнаўства ў БДУ адбывалася ў русле агульнага развіцця беларускай гістарычнай навукі, нельга не адзначыць уздзеянне, якое аказала на гэты працэс падрыхтоўка сінтэтычнага курса «Гісторыя БССР». Праца над ім была распачата яшчэ ў даваенныя гады і ажыццяўлялася падчас ВАВ, што ўзмацніла ідэалагічную падаплёку тэкстаў. Па заканчэнні вайны намаганні беларускіх гісторыкаў у гэтым напрамку яшчэ больш актуалізаваліся, а разам з тым абвастрыліся навуковыя і палітычныя калізіі. Пасля шматразовых змен аўтарскага калектыву, пераацэнкі ці ўдакладнення раней замацаваных парадыгм разумення развіцця беларускай гісторыі ў 1954 г. нарэшце быў выдадзены першы том выдання пад назвай «Гісторыя Беларускай ССР» (на вокладцы назва «Гісторыя БССР»). Пераважную большасць аўтараў можна лічыць універсітэцкімі гісторыкамі, хаця некаторыя мелі двайны статус (адначасова былі выкладчыкамі БДУ і навуковымі супрацоўнікамі Інстытута гісторыі АН БССР), напрыклад А. П. П'янкоў, К. М. Палікарповіч, М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, М. Я. Грынблат, Я. І. Карнейчык, К. І. Шабуня, Д. А. Дудкоў (яго прозвішча ў дадзеным выданні надрукавана ў чорнай рамцы), А. І. Воранава, М. П. Баранава, М. Д. Мельцэр, Л. С. Абецэдарскі, М. Б. Фрыдман, В. У. Шаціла. Нараўне з акадэмікам У. М. Перцавым рэдактарамі выдання сталі яшчэ не такія аўтарытэтныя ў асяроддзі беларускіх статусных гісторыкаў Л. С. Абецэдарскі і К. І. Шабуня.

Пасля шматгадовай «шліфоўкі» выйшаў масавым тыражом у 1958 г. і другі том кнігі. Другое выданне двухтомніка пасля ўнясення карэктываў убачыла свет

[18]Прыведзеныя статыстычныя даныя былі апублікаваны ў № 1 і 17 газеты «За ленінскія кадры» за 1938 г.
[19]За ленінскія кадры. 1938. № 15.
[20]Тут, мабыць, у часопісе закралася памылка, бо на той час вядомым у СССР спецыялістам па ўкраінскай тэматыцы была Е. М. Касачэўская.

у 1961 г. Падрабязнасці гэтай працы заслугоўваюць асобнага апавядання аб тым, як зацягнутае асэнсаванне беларускай гісторыі раз'ядноўвала розныя пакаленні яе творцаў. Палітычная сітуацыя, што імкліва змянялася, па сутнасці, прымусіла аўтараў адмовіцца ад свайго тварэння, таму нават праз гады аўтары-выкладчыкі практычна забаранялі студэнтам-гісторыкам выкарыстоўваць двухтомнік у якасці вучэбнага дапаможніка. А гісторыя беларусаў так і не змагла вырвацца з савецкіх рамак.

У 1970–80-я гг. выкладанне і даследаванне расійскай і часткова ўкраінскай гісторыі ажыццяўлялі дзве новыя кафедры, створаныя ў 1974 г.: кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду (загадчык – прафесар І. В. Аржахоўскі) і кафедра гісторыі СССР эпохі сацыялізму (загадчык – дацэнт І. А. Літвіноўскі). У найбольшай ступені ўласна расійская гісторыя вывучалася на кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду.

Перыяд 1980-х – пачатку 1990-х гг. быў характэрным у гісторыі кафедр у двух аспектах. Па-першае, перабудова і галоснасць адкрылі новыя магчымасці. Актыўна дыскутаваліся складаныя пытанні, змяніўся характар выкладання дысцыплін, стала іншым змястоўнае напаўненне навучальных курсаў. Па-другое, услед за структурнымі пераўтварэннямі быў перагледжаны склад выкладчыкаў кафедр, што не нашкодзіла традыцыям і пераемнасці. У 1990-я гг. кафедры знаходзіліся ў стане пошуку сваёй нішы ў беларускай гістарычнай навуцы, якая абнаўляла свае асновы. У той час беларуская гісторыя, якая стала па-сапраўднаму айчыннай, выйшла на першыя пазіцыі, а расійская гісторыя і славянская гісторыя павінны былі яе забяспечваць шырокім фактычным і сэнсавым кантэкстам. Пасля некаторых дыскусій у апошнім дзесяцігоддзі XX ст. на базе названых дзвюх кафедр гісторыі СССР былі створаны кафедры расійскай і славянскай гісторыі, падзеленыя храналагічнымі рамкамі прадмета даследавання і выкладання. Новае пакаленне гісторыкаў, якія працягвалі справу сваіх настаўнікаў і калег, больш смела ўзялося за вывучэнне праблем расійскай і савецкай гісторыі без абавязковых раней ідэалагічна-партыйных акцэнтаў. Новыя кафедры ўзначалілі вопытны прафесар І. В. Аржахоўскі і малады дацэнт выпускнік факультэта А. П. Салькоў.

Але ўжо праз кароткі час стала відавочна, што расійскі, украінскі і славянскі гістарычныя складнікі вельмі розныя. Сумяшчэнне расійскай і славянскай гісторыі ў дзейнасці кафедр не было прадуктыўным ні ў педагагічна-адукацыйных, ні ў навукова-даследчых адносінах. Пасля некаторых эксперыментаў па перафармаціраванні структуры кафедр у чэрвені 1998 г. былі створаны кафедра гісторыі Расіі і кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Іх выкладчыцкі склад сфарміравалі на аснове ўліку творчых інтарэсаў і магчымасцей супрацоўнікаў кафедр, што існавалі раней. Такое рашэнне зняло супярэчнасці ў выкладанні і навуковай спецыялізацыі, якія раней меліся ў кангламераце агульнай славянскай гісторыі. Узначаліў кафедру гісторыі Расіі дэкан гістарычнага факультэта дацэнт А. А. Яноўскі.

Больш чым 26-гадовая праца кафедры гісторыі Расіі дае падставы лічыць, што за гэты час не толькі адноўлены найважнейшыя навукова-педагагічныя парадыгмы, якія вызначыла першае пакаленне ўніверсітэцкіх расіязнаўцаў і ўкраіназнаўцаў, але і вылучаны шэраг новых парадыгм. На кафедры склаўся калектыў, у якім індывідуальныя навуковыя імкненні гарманічна спалучаюцца з асноўным прызначэннем кафедры – быць цэнтрам па вывучэнні гісторыі блізкіх Беларусі краін і народаў, а таксама цэнтрам падрыхтоўкі новых пакаленняў высакакласных спецыялістаў. Кафедра вядзе падрыхтоўку студэнтаў у прафесійным і агульнаадукацыйным полі гісторыі Расіі і Украіны са старажытных часоў да цяперашняга часу. Задача агульнага курса «Гісторыя Расіі і Украіны» і шэрага канкрэтных навукова арыентаваных спецкурсаў – прадставіць беларускім студэнтам адметнасць гісторыі двух народаў-суседзяў, якія прайшлі дастаткова розныя, але вельмі цесна звязаныя шляхі развіцця сваіх дзяржаў. Зразумела, у назве дадзенага курса прысутнічае пэўная ўмоўнасць, магчымая дэвальвацыя ўнікальнасці гістарычнага шляху, пройдзенага расіянамі і ўкраінцамі. Аднак такое сумяшчэнне спрыяла гарманічнаму засваенню студэнтамі і ўнікальнасці, і агульнасці гісторыі нашых суседзяў. А за кошт спецыяльных курсаў, у якіх выкладчыкі кафедры прадстаўляюць студэнтам пэўныя сюжэты з гісторыі і Расіі, і Украіны, стала магчымым паглыбляць веды і даваць шанс студэнтам спецыялізавацца ў тым ці іншым напрамку як расійскай, так і ўкраінскай гісторыі.

Адной з важнейшых задач рэалізацыі даследаванняў па розных пытаннях гісторыі Расіі з'яўляецца выкарыстанне навуковых распрацовак у навучальным працэсе. Разнастайны спектр навуковых інтарэсаў дазваляе супрацоўнікам кафедры падтрымліваць высокі ўзровень спецыялізацыі студэнтаў гістарычнага факультэта, чытаць агульныя і спецыяльныя курсы, якія асвятляюць асаблівасці палітычнай, сацыяльна-эканамічнай гісторыі Расіі і Украіны, гісторыі культуры народаў гэтых краін. Несумненна, істотным адрозненнем працы кафедры гісторыі Расіі ад яе кафедр-папярэдніц стала мэтанакіраваная падрыхтоўка менавіта расіязнаўцаў. Такім чынам, праблематыка курсавых і дыпломных студэнцкіх работ і, галоўнае, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый вызначаецца навуковай актуальнасцю выключна расійскай гісторыі. Падрыхтоўка і паспяховая абарона 4 доктарскіх і больш за 30 кандыдацкіх дысертацый, тэматыка якіх раскрывае праблематыку розных перыядаў расійскай гісторыі (дысертацыі менавіта па ўкраінскай гісторыі пакуль што не абараняліся, хаця яна ў некаторай ступені даследавалася ў кантэксце расійскай гісторыі), – несумненны станоўчы вынік

працы кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ.

У цэлым можна лічыць, што найважнейшым дасягненнем кафедры за апошнія гады стала выданне вучэбных дапаможнікаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца амаль усе яе выкладчыкі. У гэтых дапаможніках цалкам адлюстравана гісторыя Русі – Расіі і Украіны ад старажытных часоў да нашых дзён[21]. Навуковыя складнікі даследаванняў, што праводзяцца супрацоўнікамі кафедры, можна ацаніць па вялікай колькасці іх публікацый у самых розных навуковых выданнях Беларусі, Расіі, Украіны і многіх замежных краін. Традыцыйна па прычыне відавочнай неабходнасці ўсе прадстаўнікі кафедры, у тым ліку магістранты і нават студэнты-дыпломнікі, у пошуках навуковай базы для сваіх работ, нягледзячы на аб'ектыўныя фінансавыя цяжкасці, працуюць у архівах і бібліятэках Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Варшавы, Вільнюса, Кіева, Львова і іншых гарадоў.

## Заключэнне

Кожны этап развіцця ўніверсітэцкай гістарычнай навукі ў той ці іншай ступені адпавядае дзейнасці канкрэтных вучоных. Творчасць некаторых з іх ахоплівае некалькі этапаў. Адметна, што адразу пасля пачатку працы БДУ ў яго сценах разгарнуліся даследаванні практычна па ўсіх важнейшых тэмах гістарычнай навукі, нягледзячы на тое што ў Беларусі да таго часу нельга было заўважыць нават сістэмнага развіцця ўласна нацыянальнай гісторыі, не гаворачы ўжо аб звароце да агульных праблем, а таксама некаторых спецыяльных і прыватных напрамкаў гістарычнага пазнання.

Станаўленне беларускай гістарычнай навукі пачалося толькі ў XX ст. Перш за ўсё яно звязана з распрацоўкай шматлікіх напрамкаў у сценах БДУ навукоўцамі, якія ў 1921 г. сталі будаваць першы ўніверсітэт Беларусі. Спіс імёнаў гісторыкаў – прадстаўнікоў розных напрамкаў выкладання ўражвае: У. І. Пічэта, У. М. Перцаў, М. М. Нікольскі, У. М. Ігнатоўскі, А. А. Савіч, Дз. А. Жарынаў, М. В. Доўнар-Запольскі, Дз. І. Даўгяла, В. Д. Друшчыц, С. Г. Лазінскі, Ф. Ф. Турук, М. М. Шчакаціхін, А. М. Ясінскі, М. А. Янчук і інш. Іх аб'ядноўвае ў тым ліку тое, што падчас працы ў Мінску (у БДУ і АН БССР) гэтыя выдатныя гісторыкі з дастаткова рознымі спецыялізацыямі прадуктыўна займаліся выкладаннем і даследаваннямі ў галіне расіязнаўства, а таксама праявілі сябе як беларусазнаўцы. Гісторыкі былі не толькі сярод найбольш актыўных арганізатараў стварэння БДУ і праваднікоў ідэі і практыкі ўніверсітэта ў 1920-я гг. і складаныя 1930-я гг. Яны змаглі захаваць годны ўзровень універсітэта, працягнуць даследчую і педагагічную дзейнасць, ствараючы з 1934 г. гістарычны факультэт па «лекалах» падобных класічных інстытуцый як былых расійскіх імператарскіх універсітэтаў, так і еўрапейскіх універсітэтаў XX ст.

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў Беларусі склалася трывалая навуковая школа расіязнаўцаў, асновы якой закладваліся з моманту стварэння БДУ, але ў поўнай меры былі замацаваны ў гады суверэннага развіцця Рэспублікі Беларусь. Навукоўцы кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ сёння павышаюць дасягнуты ўзровень і будуюць творчыя планы на даследаванні ў запатрабаваных сучаснымі грамадска-палітычнымі рэаліямі напрамках. Яны стварылі паўнавартасныя падручнікі і дапаможнікі, неабходныя для забеспячэння выкладання ва ўніверсітэтах краіны курса «гісторыя Расіі і Украіны», гэтыя выданні пастаянна абнаўляюцца і удасканальваюцца. Акрамя таго, супрацоўнікі кафедры рыхтуюць новыя пакаленні беларускіх расіязнаўцаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Каценбоген СЗ. *Белорусский государственный университет в 1922/23 учебном году (итоги и перспективы).* Минск: 1-я гостипография «Белтрестпечати»; 1923. 52 с.
2. Зеленов МВ. *Аппарат ЦК РКП(б) – ВКП(б), цензура и историческая наука в 1920-е годы*. Нижний Новгород: Нижполиграф; 2000. 538 с.
3. Моциэнок ВЭ. А. В. Луначарский и общеобразовательная школа 20-х годов. В: Воронежский государственный университет. *Страницы истории и историографии Отечества. Выпуск 2*. Воронеж: Издательство Воронежского государственного университета; 1999. с. 115–130.

[21]История России. XX век : учеб. пособие / под ред. В. И. Меньковского, О. А. Яновского. Минск : РИВШ, 2005. 704 с. ; История России и Украины (XIX – начало XX в.) : в 2 ч. / под ред. В. В. Сергеенковой, В. И. Меньковского, О. А. Яновского. Минск : БГУ, 2008. Ч. 1. 367 с. ; 2010. Ч. 2. 535 с. ; История России и Украины (с древнейших времен до конца XVIII в.) / под науч. ред. О. А. Яновского. Минск : БГУ, 2012. 503 с. ; История России и Украины (XX – начало XXI в.) : учеб. пособие / под ред. В. И. Меньковского, О. А. Яновского, В. В. Сергеенковой. Минск : БГУ, 2020. 287 с. ; *Позняк С. В.* История Украины (IX – первая половина XVIII в.) : курс лекций. Минск : БГУ, 2002. 163 с. ; *Лугаўцова С. Л., Кахновіч В. А., Цемушаў С. М.* Гісторыя Украіны ад старажытных часоў да пачатку XX ст. (з электронным дадаткам) : дапаможнік / пад навук. рэд. А. А. Яноўскага. Мінск : БДУ, 2019. 240 с. ; Всеобщая история России с древнейших времен до конца XVIII века / под ред. О. А. Яновского. М. : Эксмо, 2008. 592 с. ; История России: новое и новейшее время / под науч. ред. О. А. Яновского. М. : Эксмо, 2010. 784 с. ; Современная российская историография : в 2 ч. / под ред. В. И. Меньковского. Минск : РИВШ, 2009. Ч. 1. 338 с.; Ч. 2. 274 с. ; Кортеж российской власти. IX–XXI века : биограф. справ. : в 3 ч. / под ред. О. А. Яновского. Минск : РИВШ, 2013. Ч. 1. 400 с. ; 2014. Ч. 2. 290 с. ; 2014. Ч. 3. 332 с. ; Университетоведение : учеб.-метод. пособие (с приложением CD) / под общ. ред. О. А. Яновского. Минск : БГУ, 2011. 343 с.

4. Пичета ВИ. История Белоруссии в советской историографии. В: Волгин ВП, Тарле ЕВ, Панкратова АМ, редакторы. *Двадцать пять лет исторической науки в СССР*. Москва: Издательство АН СССР; 1942. с. 179–188.
5. Плотникова Е. Всесоюзное совещание руководителей кафедр общественных наук. *Вопросы истории*. 1945;5–6: 204–206.

## References

1. Katzenbogen SZ. *Belorusskii gosudarstvennyi universitet v 1922–23 uchebnom godu (itogi i perspektivy)* [Belarusian State University in the 1922–23 academic year (results and prospects)]. Minsk: 1-ya gostipografiya «Beltrestpechati»; 1923. 52 p. Russian.
2. Zelenov MV. *Apparat TsK RKP(b) – VKP(b), tsenzura i istoricheskaya nauka v 1920-e gody* [The apparatus of the Central Committee of the RCP(b) – VKP(b), censorship and historical science in the 1920s]. Nizhny Novgorod: Nizhpoligraf; 2000. 538 p. Russian.
3. Motsienok VE. [A. V. Lunacharskii and comprehensive school of the 1920s]. In: Voronezh State University. *Stranitsy istorii i istoriografii Otechestva. Vypusk 2* [Pages of history and historiography of the Fatherland. Issue 2]. Voronezh: Publishing house of the Voronezh State University; 1999. p. 115–130. Russian.
4. Picheta VI. [History of Belarus in Soviet historiography]. In: Volgin VP, Tarle EV, Pankratova AM, editors. *Dvadtsat' pyat' let istoricheskoi nauki v SSSR* [Twenty-five years of historical science in the USSR]. Moscow: Publishing house of the Academy of Sciences of the USSR; 1942. p. 179–188. Russian.
5. Plotnikova E. [All-Union conference of heads of departments of social sciences]. *Voprosy istorii.* 1945;5–6:204–206. Russian.

*Получена 15.09.2024 / принята 02.10.2024.*
*Received 15.09.2024 / accepted 02.10.2024.*